ализация деятельности православного духовенства в сословных и церковно-приходских организациях способствовала решению социальных проблем населения; организации социальной защиты инвалидов, сирот, несовершеннолетних, престарелых; распространению грамотности; утверждению позиций православия на территории Беларуси.

## Библиографический список

1. Отчет о состоянии Полоцкой епархии за 1900 год / Российский государственный исторический архив – Ф. 796. Оп. 442. Д. 1857. Л. 3 об. – 71 об.

2. Отчет о состоянии церковно-приходских школ Полоцкой епархии за 1886/1887 учебный год // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1887. – № 24 (часть неофициальная). – С. 770.

3. *Руновский, Н. П.* Церковно-гражданские законоположения относительно православного духовенства в царствование императора Александра II. – Казань, 1898.

4. *Серебренников, Н.* Краткий историко-статистический очерк развития церковной школы Полоцкой епархии / Н. Серебренников….за 1884–1909 гг. – 26 с.

УДК 347.64-058.12(476+474.5-89)(091)"17/18"

# РАЗВІЦЦЁ ЗАКАНАДАЎСТВА АБ ДЗЕЙНАСЦІ ДВАРАНСКІХ АПЕК У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

**К. Р. Кімбар**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, katsyaryna.kimbar@yandex.ru*

У артыкуле аналізуюцца заканадаўчыя асновы дзейнасці дваранскіх апек у беларускіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. Дваранскія апекі ствараліся як саслоўныя органы для апекавання над удовамі і сіротамі дваранскага паходжання, але іх паўнамоцтвы паступова пашыраліся. На падставе заканадаўчых актаў вызначаны механізмы працы інстанцыі і дзейнасці дваранскіх апекуноў.

***Ключавыя словы:*** беларускія губерні; заканадаўства; дваранства; апека; дваранскія апекі.

# РАЗВИТИЕ ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ДВОРЯНСКИХ ОПЕК В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ В КОНЦЕ XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX в.

**Е. Р. Кимбор**

*Институт истории Национальной академии наук Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, katsyaryna.kimbar@yandex.ru*

В статье анализируются законодательные основы деятельности дворянских опек в белорусских губерниях в конце XVIII – первой половине XIX в. Дворянские опеки со-

здавались как сословные органы для попечительства над вдовами и сиротами дворянского происхождения, но их полномочия постепенно расширялись. На основе законодательных актов определёны механизмы работы инстанции и деятельности дворянских опекунов.

***Ключевые слова:*** белорусские губернии; законодательство; дворянство; опека; дворянские опеки.

## DEVELOPMENT OF LEGISLATURE ON THE ACTIVITY OF GUARDIANSHIP COUNCILS FOR NOBILITY IN THE BELARUSIAN PROVINCIES IN THE END OF THE 18th – THE FIRST HALF OF THE 19th CENTURY

**K. Kimbar**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Academicheskaya, 1, 220072, Minsk, katsyaryna.kimbar@yandex.ru*

The article analyzes the legislative foundations for the activities of noble guardianships in the Belarusian governorates at the end of the 18th – the first half of the 19th century. Noble guardianships were created as estate institutions for guardianship of widows and orphans of noble origin, but their powers gradually expanded. On the basis of legislative acts, the mechanisms of work of the institution and the activities of noble guardians are determined.

***Keywords:*** Belarusian governorates; legislation; nobility; guardianship; noble guardianships.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння беларуска-літоўскіх зямель да Расійскай імперыі на грамадства былога Вялікага Княства Літоўскага распаўсюдзіўся чатырохсаслоўны падзел расійскага ўзору: прывілеяваныя саслоўі – дваранства і духавенства і «падатковыя» саслоўі – гарадскія і сельскія абывацелі. Сіроцтва было актуальнай праблемай для Расійскай імперыі, аднак механізмы яе вырашэння выбудоўваліся асобна для кожнага саслоўя.

Для апекавання ўдовамі і дзецьмі-сіротамі дваранскай прыналежнасці ў Расійскай імперыі паводле заканадаўчага акта «Учреждения для управления губерний Всероссийской империи» ад 4 лістапада 1775 г. ствараліся дваранскія апекі: «При каждом Уездном Суде учреждается место, под названием: Дворянская Опека» [2, с. 232]. Глава XVI гэтага дакумента была цалкам прысвечана складу і кампетэнцыям гэтых устаноў. У ёй удакладнялася, што дваранскія апекі павінны былі ствараціца пры кожным верхнім земскім судзе (інстанцыя, якая з’яўлялася губернскім судом для дваранства [1, с. 290–291]), а ў іх склад уваходзілі павятовы прадвадзіцель дваранства, суддзя і засядацелі павятовага суда. Пасяджэнні гэтага органа мусілі праходзіць тры разы на год адначасова з пасяджэннямі павятовага суда, а пры

неабходнасці часцей праз загад верхняга земскага суда або губернатара) [2, с. 247–249].

Паводле «Учреждений для управления губерний», дваранскія апекі падпарадкоўваліся верхнім земскім судам, а таксама губернскім праўленням і выконвалі ўказы і загады ад абодвух органаў [2, с. 290]. Паводле закона, дваранская апека дасылала свае распараджэнні для выканання ў ніжні земскі суд (земскую судова-паліцэйскую інстанцыю) адпаведнага павета або ў гарадскую паліцыю да гараднічага і вяла з імі ліставанне. Абскардзіць рашэнні дваранскай апекі можна было ў верхнім земскім судзе, куды перанакіроўвалася справа на паўторны разгляд [2, с. 249, 290].

Працэс усталявання апекі, паводле закона, пачынаўся з паведамлення дваранскай апецы пра ўдоў ці дваранскіх дзяцей, якія засталіся без бацькоў у канкрэтным павеце. У ролі такіх ініцыятараў маглі выступаць павятовы прадвадзіцель дваранства, удава, бліжэйшыя родзічы і сваякі малалетніх дзяцей або, калі ніякіх сваякоў не засталося, два пабочныя сведкі і прыходскі святар, на якога ўскладаўся абавязак паведамляць дваранскім апекам пра ўдоў і малалетніх сірот у яго прыходзе. Таксама закон прадугледжваў ўсталяванне апекі па загадзе Губернскага праўлення, Палат грамадзянскага суда або верхняга земскага суда [2, с. 247]. Пра апякунскае кіраванне дваранская апека абавязвалася даваць справаздачы перад верхнім земскім судом штогадова [2, с. 248].

Праца дваранскіх апек уключала ў сябе некалькі паслядоўных этапаў: прызначэнне апекуноў, вопіс з іх удзелам маёмасці памерлага, кантроль за апекунамі праз справаздачы, якія трэба было падаваць у дваранскую апеку штогададова. Асобна законам прапісваліся правілы апекі над удовамі. Ім апекуны прызначаліся толькі па іх жаданні, а дваранская апека абавязвалася адстойваць іх маёмасныя інтарэсы ў судзе і прадастаўляць ім бясплатныя паслугі страпчых [2, с. 248].

Можна меркаваць, што ў выпадку дзяцей-сірот дваран апека ўсталёўвалася не толькі і не столькі над самімі дзецьмі, колькі над іх маёмасцю. У артыкуле главы XVI «Учреждений о губерниях» гаварылася: «Буде же малолетный остался без всякого имения, тогда дворянская опека старается поместить его в общественных училищах, или записать в какую ни есть службу императорскаго величества; вдовам же, у коих нет ни какого имения, старается доставить пристанище и пропитание приличное их состоянию» [2, с. 248]. Такім чынам, калі гэтай маёмасці не было, то закон прадугледжваў магчымасць пазбегнуць прызначэння апекуна і перадаць паўнамоцтвы па выхаванні сіраты вучылішчам ці нейкай «службе», на якую можна было ўладкаваць дваранскага падлетка. Верагодна, гаворка ў законе ішла перша за ўсё пра хлопчыкаў-дваран, якіх імкнуліся хутчэй інтэграваць у грамадства.

Апекунамі было прадпісана прызначаць перш за ўсё тых, каго вызначалі ў тэстаментах памерлыя бацькі. Калі бацькі не вызначылі апекуноў, то іх прызначэннем займалася дваранская апека. Выбіраць можна было як са сваякоў дзяцей, так і з пабочных асоб, «кои добродетельными качествами своими, честностию и не зазорным поведением более подают надежды к призрению малолетнаго в здравии, благородном воспитании и пристойном содержании, и от которых отеческого попечения к малолетному ожидать непременно можно». Таксама ў законе было вызначана, хто не можа быць апекуном – марнатраўцы ўласнага маёнтка, тыя, хто меў відавочныя заганы або падвяргаўся судоваму пакаранню, занадта жорсткія людзі або тыя, хто знаходзіўся ў сварцы з бацькамі малалетніх [2, с. 247–248].

Паводле 215 артыкула XVI главы «Учреждений о губерниях», апякун у прысутнасці сакратара павятовага суда і двух дваран-сведкаў павінен быў апісаць усю маёмасць, якая перайшла ад памерлых у спадчыну іх дзецям. Адзін асобнік вопісу перадаваўся ў дваранскую апеку, а іншы захоўваўся ў апекуна [2, с. 248]. Асобны 221 артыкул XVI главы «Учреждений о губерниях» – «Примерное, или повальное наставление опекунам» – акрэсліваў сутнасць здзяйснення апекі, а таксама ўтрымліваў рэкамендацыі да апекуноў ад дваранскай апекі. У ім яшчэ раз прапісвалася пажаданае маральнае аблічча апекуна: «Опекуну надлежит быть с доброохвотством, кротку, человеколюбиву, попечительну, радиву и усердну к пользе малолетнаго». Паводле «Наставления», апекуны павінны былі прыняць маёмасць малалетніх дваран па вопісе пад сваю апеку, захоўваць яе, весці прыходна-расходны ўлік у маёнтках, дбаць пра належнае выхаванне дзяцей і забяспечваць іх з даходаў, якія прыносілі маёнткі. Акрамя таго, апекунам трэба было сачыць за вядзеннем гаспадаркі ў маёнтках, рамантаваць крохкія пабудовы і дарогі, захоўваць у цэласці склад прыслугі і прыгонных сялян і не павышаць іх павіннасці, але лішніх і бескарысных у гаспадарцы адпускаць на аброк ці прызначаць да іншай работы, плаціць па пазыках і спаганяць грошы з даўжнікоў. За сваю працу апякун мог прэтэндаваць на 5 % даходаў з маёнтка штогод (але калі апекуноў было некалькі, сума дзялілася паміж імі). Апека спынялася «по совершеннолетии малолетнаго», і ў гэты год апекуны абавязаны былі прадаставіць апошнюю справаздачу дваранскай апецы [2, с. 249–251].

Заснаванне дваранскіх апек і іх склад былі пацверджаны «Грамотой на права, вольности и преимущества благородного российского дворянства» ад 21 красавіка 1785 г. «Грамота» спасылалася на «Учреждения о губерниях» – «По силе 20 и 209 статей Учреждений, при каждом Уездном суде учреждается место под названием: Дворянская Опека, для Дворянских вдов и малолетных» [3, с. 351].

Дваранская апека, як орган, які быў звязаны з верхнім земскім судом і часткова выконваў выконваў судовыя функцыі, быў закрануты зменамі ў судовай сістэме Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. Так, верхнія земскія суды былі скасаваны ў сістэме кіравання губернямі, зацверджаных імператарам Паўлам I 31 снежня 1796 г. Таму ніжнія земскія суды сталі называцца на практыцы «земскими судами» [25, с. 4]. Функцыі верхніх земскіх судоў перадаваліся ў Палату Суда і Расправы. Палата Суда і Расправы – гэта орган, у якім Павел I аб’яднаў Палаты Крымінальнага і Грамадзянскага суда, створаныя Кацярынай II ва «Учреждениях о губерниях» у якасці судовых органаў сярэдней інстанцыі. Гэтая Палата падзялялася на два дэпартаменты – крымінальных і грамадзянскіх спраў, і ведамства над дваранскімі апекамі знаходзілася менавіта ў грамадзянскім дэпартаменце [25, с. 17–18]. У сувязі з гэтым 13 верасня 1798 г. выйшаў сенацкі ўказ: «Дворянским Опекам <…> за упразднением Верхних Земских Судов <…> о состоянии имений малолетных и Опекунском управлении, а равно сему о продажах и закладах таковых имений, относиться в Палату Суда и Расправы Гражданский Департамент, а от сей для согласования, касательно продажи, заклада и представления Сенату, сообщать в Губернския Правления» [4]. Згодна з сенацкім указам ад 13 студзеня 1801 г., удакладнялася, што Палата грамадзянскага суда і Расправы павінна была назіраць за дзеяннямі дваранскіх апек і прымаць на іх скаргі [5, с. 520].

Указ імператара Аляксандра I Сенату ад 9 верасня 1801 г., які ўводзіў новы адмінстрацыйна-тэратарыяльны падзел дзяржавы (у прыватнасці, Беларуская губерня стала падзяляцца на Магілёўскую і Віцебскую, а Літоўская – на Гродзенскую і Віленскую), вярнуў Палаце Суда і Расправы «прежнее ея разделение и именование Палаты Уголовнаго и Палаты Гражданского Суда», а таксама пашырыў склад некаторых органаў і інстанцый. Так, у штат дваранскіх апек уводзілася пасада пратакаліста [6].

У наступных заканадаўчых актах, якія прымаліся ў першай палове XIX ст. і датычыліся дваранскіх апек, прасочваліся ў асноўным дзве тэндэнцыі: пашырэнне функцый дваранскіх апек і ўдакладненне механізмаў іх працы. Яшчэ ва ўказе ад 13 студзеня 1801 г. было прапісана: «…из состоящих в Государстве по Губерниям Дворянских, купеческих и мещанских имений находятся в опеках и поступают в оныя не только принадлежащия малолетным, но и в разсуждении разстроившагося состояния совершеннолетних разнаго звания людей и классов» [5, с. 518]. Ва ўказе ад 23 чэрвеня 1804 г. пра продаж маёнткаў, якія апісалі за казённыя даўгі і спагнанні, гаварылася, што яны «состоят в опеке» і праз апекуноў павінны былі прадавацца без аукцыёна, а па спецыяльным кошце [7].

Канчаткова новая сфера дзейнняў дваранскіх апек прапісвалася ў Маніфесце Аляксандра I ад 16 мая 1811 г. пра недаімкі па розных зборах і

падатках: «Вместе секвестра на недоимочныя помещичьи селения <…> Губернского Правление предписывает немедленно вять таковое имение в опеку <…>. Имение, взятое в опеку, возвращается помещику немедленно, как скоро недоимка будет взыскана» [10, с. 651]. Тым не менш, паміж markednымі ўказамі ўзнікалі супярэчанні: маёнткі за казённыя спагнанні і па пазнейшых пастанаўленнях бралі ў секвестр пад казённы нагляд, таму сенацкім указам ад 19 лістапада 1826 г., было яшчэ раз пацверджана, што такія маёнткі павінны паступаць у дваранскія апекі [15]. Акрамя маёнткаў даўжнікоў, у дваранскія апекі з 1815 г. сталі паступаць маёнткі, праз якія ўзнікалі спрэчкі спадкаемцаў паводле духоўных запаветаў [12]. Паводле ўказа ад 25 лістапада 1815 г. прызначаўся тэрмін 2 гады на тое, каб абскардзіць паступленне такіх маёнткаў у чыю-небудзь уласнасць, і ўвесь гэты перыяд маёнтак мусіў знаходзіцца ў ведамстве дваранскіх апек [11].

Што датычылася ўдакладнення механізмаў працы дваранскіх апек, то ўжо ў 1804 г. законам было вызначана, што калі маёнтак, які знаходзіцца пад апекай, размешчаны ў розных паветах, то такая апякунская справа перадавалася адной дваранскай апецы [9]. Верагодна, шмат пытанняў узнікала на практыцы з законнасцю продажы маёмасці, якая знаходзілася пад апекай. З аднаго боку, гэта было забаронена, бо апекуну трэба было захоўваць яе ў цэласці, а з іншага – трэба было плаціць па пазыках і забяспечваць вядзенне гаспадаркі. З 1807 г. апекунам было дазволена прадаваць «жизненные припасы» (зерне, рагатая і дробная жывёла, мука і г. д. [18, с. 278]), не просячы дазволу на гэта ў Сената. Тлумачылася гэта тым, што «припасы» могуць хутка псавацца [8]. У 1819 г. было забаронена прадаваць маёнткі, якія належалі малалетнім дзецям памерлых даўжнікоў, без дазволу Сената [13]. 12 сакавіка 1824 г. выйшаў асобны ўказ, які рэгуляваў продаж маёмасці малалетніх дзяцей пад апекай – агульны як для дваран, так і для мяшчан. Паводле яго, было дазволена прадаваць рухомую маёмасць, якая не падвяргаецца хуткаму сапсаванню (золата, срэбра, дыяманты, пярліны), толькі ў трох выпадках: калі гэта было неабходна для выплаты пазыкаў, для фінансавага забеспячэння дзяцей-сірот або калі гэтымі рэчамі гандлявалі памерлыя бацькі сіраты. У іншых выпадках трэба было запытвацца дазволу Сената праз дваранскія апекі або сіроцкія суды [14].

Пытанне фінансававання дваранскіх апек было ўдакладнена ў сенацкім ўказе ад 16 студзеня 1835 г.: «Как Дворянския Опеки учреждены для дел собственно дворянскаго сословия, то и увеличение содержания Канцелярий оных должно относить на одни дворянския имения» [16]. У зацверджаным Мікалаем I 28 красавіка 1836 г. палажэнні Камітэта міністраў грошы з дваранскіх маёнткаў рэкамендавалася браць «тем же порядком, как и сбор на содержание Канцелярий Дворянских Депутатских Собраний и

Предводителей». А менавіта ўносіць графу выдаткаў у прыватныя земскія павіннасці памешчыцкіх сялян [17].

Прававыя нормы функцыянавання дваранскіх апек і правілы для апекуноў дваранскай маёмасці дзяцей-сірот і ўдоў ўвайшлі ў кадыфікаваны Звод законаў Расійскай імперыі. У «Зводзе законаў» (1835 г.) у першай частцы Х тома «Законы гражданские» ў кнізе I «О правах и обязанностях семейственных» быў вылучаны раздзел III «Об опеке и попечительстве в порядке семейственном». У яго першую главу «Об опеке и попечительстве над несовершеннолетними» ўвайшлі правілы вызначэння ўзросту непаўналецця, правоў непаўналетніх на маёмасць, апекі і папечыцельства над імі.

Так, у артыкуле 178 гаварылася: «Попечение о дворянских сиротах возлагается на Дворянскую Опеку» [19, с. 47], іншыя артыкулы (№ 177, 187–193, 196–213), якія датычыліся апекі над дваранскімі дзецьмі, па сутнасці паўтаралі змест «Учреждений для управлениями губерний Всероссийской империи» 1775 г. і пазнейшых указаў. Многія нормы былі прапісаны адначасова для дваранскіх апек і сіроцкіх судоў (правілы па ўсталяванні апекі, вызначэнні апекуноў, іх абавязкаў і г. д.) [19, с. 43–56]. У II томе «Свод учреждений государственных и губернских» частцы 2 «Учреждения губернские» у III кнізе «Учреждение властей и мест уездных» у раздзеле IV «Учреждение судебнаго управления в уездах» глава II была прысвечана дваранскім апекам – іх функцыям, складу, падпарадкаванасці (артыкулы № 848–855) [20, с. 212–213].

У рэдакцыях «Звода законаў» 1842 і 1857 гг. выдання змест заканадаўчых норм для дваранскіх апек захаваўся, але пад іншай нумарацыяй [21, с. 35–49] [23, с. 40–54] [22, с. 679–680] [24, с. 781–782].

Такім чынам, развіццё заканадаўства аб дзейнасці дваранскіх апек пачалося з зацверджаных Кацярынай II ў 1775 г. «Учреждений для управлениями губерний Всероссийской империи». Дваранская апека, паводле гэтага дакумента, засноўвалася як пявятовая інстанцыя для апекі над дваранскімі ўдовамі і сіротамі канкрэтных паветаў. Былі прапісаны склад установы, парадак працы і правілы для апекуноў і іх узаемадзення з дваранскімі апекамі. Пры гэтым, закон прадугледжваў, што апека над дзецьмі-сіротамі дваран усталёўвалася абавязкова, бо да іх па спадчыне пераходзілі маёнткі, якімі яны не маглі распараджацца без апекуноў. Над удовамі апека ўсталёўвалася па іх жаданні і ў залежнасці ад іх матэрыяльнага становішча.

На працягу першай паловы XIX ст. на заканадаўчым узроўні паступова пашыраліся паўнамоцтвы дваранскіх апек: акрамя клопату над сіротамі і ўдовамі, яны сталі адказныя за апеку над маёнткамі дваран, якія мелі казённыя пазыкі, а таксама над дваранскімі маёнткамі, праз якія ўзнікалі спрэчкі па духоўных тэстаментах. Іншыя законы дапаўнялі некаторыя аспекты

дзейнасці дваранскіх апек: дазвол на продаж маёмасці пад апекай, тэрытарыяльныя паўнамоцтвы органа, правілы яго фінансавання.

Палажэнні «Учреждений для управлениями губерний Всероссийской империи» і пазнейшыя разгледжаныя вышэй указы сталі асновай законаў, прысвечаных дваранскім апекам і дзейнасці дваранскіх апекуноў, у кадыфікаваным заканадаўчым зборы – Зводах законаў Расійскай імперыі 1835, 1842 і 1857 гг. выдання. Законы аб дваранскіх апеках рабіліся, такім чынам, часткай як сямейнага (у галіне апекі над непаўналетнімі дваранамі), так і дзяржаўнага права (орган уваходзіў у сістэму судовага кіравання ў паветах) Расійскай імперыі.

На падставе пераважнай большасці заканадаўчых норм, прысвечаных дваранскай апецы, можна меркаваць, што апека па расійскім заканадаўстве ў першую чаргу ўсталёўвалася над маёмасцю, а не над асобай. Гэта пацвярджаецца тым, што па законе сіроты, якія не мелі маёмасці, аддаваліся ў спецыяльныя навучальныя ўстановы, а не браліся пад апеку дзяржавы.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Луговцова, С. Л.* Реформирование системы судебных учреждений Беларуси в последней трети XVIII в. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 4 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2009. С. 289–295.
2. Полное Собрание Законов Российской Империи (далей – ПСЗРИ): Собрание первое : [С 1649 по 12 декабря 1825 г.]. СПб. : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1830. Т. 20. С. 229–304. № 14392.
3. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 22. С. 344–358. № 16187.
4. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 25. С. 385. № 18667.
5. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 26. С. 518–520. № 19741.
6. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 26. С. 775–778. № 20004.
7. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 28. С. 320–325. № 21296.
8. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 29. С. 1508. № 22541.
9. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 31. С. 402–403. № 21361.
10. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 31. С. 649–651. № 24633.
11. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 33. С. 381–382. № 26004.
12. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 33. С. 54–55. № 25815.
13. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 36. С. 509–511. № 28038.
14. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 39. С. 217–218. № 29837.
15. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 1. С. 1216–1217. № 682.
16. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 10, ч. 1. С. 47. № 7767.
17. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 11, ч. 1. С. 455. № 9116.
18. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 36, ч. 2. С. 277–279. № 37247.
19. Свод законов Российской империи (далей – СЗРИ) [повелением Государя императора Николая Павловича составленный]. СПб. : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1835–1836. Т. 10. Свод законов гражданских и межевых: ч. 1 и 2. 1835. 1137 с.
20. СЗРИ. СПб, 1835–1836. Т. 2. Свод учреждений государственных и губернских. Ч. 2. Учреждения губернские. 1835. 900 с.
21. СЗРИ. СПб, 1842–1855. Т. 10. Свод законов гражданских и межевых: ч. 1 и 2. 1842. 1020 с.

22. СЗРИ. СПб, 1842–1855. Т. 2. Свод учреждений государственных и губернских. Ч. 2. Учреждения губернские. 1842. 1753 с.
23. СЗРИ. СПб, 1857. Т. 10. Ч. 1. Законы гражданские. 1857. 491 с.
24. СЗРИ. СПб, 1857. Т. 2. Ч. 1. Общее учреждение губернское. 1857. 1474 с.
25. *Томсинов, В. А.* Судебная система Российской империи в XVIII – первой половине XIX в. (по материалам законодательных актов). Статья первая // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 11. Право, 2016. № 3. С. 3–24.

УДК 94 (476): 351.745

# СОСЛОВНОЕ ПРОИСХОЖДЕНИЕ И ИМУЩЕСТВЕННОЕ ПОЛОЖЕНИЕ ЧИНОВНИКОВ УЕЗДНОЙ ПОЛИЦИИ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ НА РУБЕЖЕ XIX–XX вв.

**А. А. Киселёв**

*Белорусский государственный экономический университет, пр. Партизанский, 26, 220070, г. Минск, kiselev_aa@list.ru*

На рубеже XIX–XX вв. состав чиновников уездной полиции белорусских губерний комплектовался из представителей практически всех сословий. Подавляющее большинство чиновников не имели недвижимой собственности. Источником их существования являлась государственная служба.

***Ключевые слова:*** уездная полиция; социальный состав; белорусские губернии; имущественное положение.

# CLASS ORIGIN AND PROPERTY STATUS OF COUNTY POLICE OFFICIALS BELARUSIAN PROVINCES AT THE TURN OF THE XIX–XX CENTURIES

**A. Kiselev**

*Belarusian State Economic University, 26, Partizanski Av, Minsk 220070, Belarus, kiselev_aa@list.ru*

At the turn of the $19^{th}$ – $20^{th}$ centuries the composition of district police officials in the Belarusian provinces was made up of representatives of almost all classes. The vast majority of officials did not have real estate. The source of their existence was the public service.

***Keywords:*** county police; social composition; Belarusian provinces; property status.

В белорусской историографии отмечалось, что основной тенденцией социального развития второй половины XIX – начала XX вв. являлись процессы модернизации, которые выражались в формализации сословных границ, социальной мобильности [1, с. 264]. В этой связи представляет интерес вопрос о том, в какой степени данные процессы отразились на социальном составе чиновничества белорусских губерний. В качестве примера приведем сведения о сословном происхождении и имущественном положении